ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕ

# Беларус УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 28 (861) ● ЧАЦВЕР, 19 кастрычніка 1972 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

## СПРАВАЗДАЧУ ДАЕ МЯСЦКОМ

Адбылася агульнауніверсітэцкая прафсаюзная канферэнцыя. З дакладам аб рабоце мясцкома выступіў яго старшыня В. Ф. Чыгір.

Дэлегаты прафсаюзнай канферэнцыі, абмеркаваўшы даклад, прызналі работу мясцовага камітэта універсітэта здавальняючай.

У сувязі з тым, што з гэтага года мясцкому БДУ прадастаўлены правы райкома прафсаюза, у яго састаў выбрана 37 чалавек.

На арганізацыйным пасяджэнні пленума МК выбран прэзідыум у саставе 11 чалавек. Абавязкі паміж членамі прэзідыума размеркаваліся наступным чынам:

1. Чыгір В. Ф.— старшыня МК, старшыня камісіі сацстраху.
2. Ляпіла М. Я.— вызвалены намеснік старшыні МК.
3. Пальцаў А. А. — старшыня вытворчай камісіі.
4. Мяцельскі М. А. — старшыня жыллёва-бытавой камісіі.
5. Сакoвіч Д. М. — намеснік старшыні МК, старшыня арганізацыйнай камісіі.
6. Сабіла К. У.— старшыня камісіі па ахове працы і тэхнікі бяспекі.
7. Зяневіч З. А. — старшыня культурна-масавай камісіі.
8. Кляўчэня А. С. — намеснік старшыні МК, старшыня палітыка-выхаваўчай камісіі.
9. Ануфрыеў Я. М. — прадстаўнік МК у камісіі па працоўных спрэчках.
10. Монак І. С.— старшыня спартыўна-масавай камісіі.
11. Юзафовіч М. І. — старшыня камісіі па грамадскаму харчаванню.

## ВЕСТКІ З ГЕАФАКА

Да 50-годдзя СССР на факультэце рыхтуюцца стэнды, прысвечаныя дасягненням саюзных рэспублік.

* * *

Аб праходжанні студэнтамі факультэта летняй практыкі ў Народнай Рэспубліцы Балгарыі расказвае стэнд, які зрабілі ўдзельнікі гэтай паездкі пад кіраўніцтвам выкладчыка Г. Я. Рылюка.

* * *

Нядаўна факультэт урачыста віншаваў спартсменаў I курса. Яны заваявалі кубак па футболу ў першынстве паміж першымі курсамі універсітэта.

* * *

Як лепш арганізаваць свой рабочы дзень, як весці канспект, як зрабіць студэнцкае жыццё больш цікавым і змястоўным, расказваюць пяцікурснікі пачынаючым студэнтам у час гутарак, што праводзяцца на I курсе.

* * *

116 студэнтаў V курса праходзяць цяпер практыку ў школах Мінска. Іх рукамі зроблены стэнды, наглядныя дапаможнікі. З цікавасцю слухаюць школьнікі палітінфармацыі і лекцыі практыкантаў.

Задаволены працай Галі Сайко, Алега Патапейкі і іншых студэнтаў у школе № 9. «Добра» і «выдатна»—так ацэнены іх урокі.

* * *

Добра папрацавалі студэнты факультэта на ўборцы бульбы. З чатырох гаспадарак, куды былі накіраваны студэнты, прыйшлі на факультэт граматы і падзякі за выдатную работу.

## ГОД ПЕРШЫ

У гэтым юбілейным годзе пасля цяжкіх уступных экзаменаў занялі свае месцы на фізічным факультэце 375 першакурснікаў. Хто ж прыйшоў у студэнцкія аўдыторыі, лабараторыі? Сярод першакурснікаў мы бачым учарашніх школьнікаў В. Рудога, Г. Яцэнку, А. Гусева, перадавых рабочых В. Барадзіна, В. Ліпай, дэмабілізаваных з радоў Савецкай Арміі салдат і сяржантаў В. Бакаева, А. Пугача, В. Нікалаеўскага.

У першы ж дзень заняткаў з першакурснікамі быў праведзен сход, на якім выступілі дэкан факультэта І. П. Зяцькоў, намеснік дэкана А. А. Лабуда, сакратар камітэта камсамола Г. Стакроцкі.

У карыстанне студэнтаў прадастаўлены аўдыторыі, лабараторыі, бібліятэка, чытальныя і спартыўныя залы. Пакуль нічога нельга сказаць аб поспехах першакурснікаў у вучобе. Трэба пачакаць вынікаў першых залікаў і экзаменаў. Аднак у грамадскім жыцці факультэта і універсітэта камсамольцы - першакурснікі ўдзельнічаюць актыўна. Яны першымі на факультэце правялі стопрацэнтную падпіску на перыядычны друк. Тут вызначыліся актывісты - камсамольцы А. Пугач, А. Аксючыц, Г. Яцэнка, В. Дуняк і іншыя.

8 кастрычніка ў парку Перамогі праходзіў крос. У ім прынялі ўдзел усе камсамольцы - першакурснікі. Немалаважную ролю ў гэтым адыграў камсамольскі актыў першага курса.

Цяперашні год асаблівы, юбілейны, адзначаны бацькоўскімі клопатамі партыі і ўрада аб павышэнні дабрабыту студэнтаў нашай краіны. Таму хочацца пажадаць сённяшнім першакурснікам, людзям, розным па ўзросту і вопыту жыцця, але маючым адну мэту — вучобу, адказаць на клопаты выдатнай здачай зімовай сесіі і актыўным удзелам у грамадска - палітычным жыцці факультэта.

**М. БЯЛЕВІЧ,**
**сакратар камсамольскага бюро патока.**

*Сапраўдным святам для першакурснікаў стала традыцыйнае пасвячэнне ў студэнты. Каля дзвюх тысяч фізікаў, матэматыкаў, гісторыкаў атрымліваюць у гэты дзень разам з заліковай кніжкай вялікае права і абавязак—вучыцца ў вну.*

*Аб пасвячэнні ў студэнты першакурснікаў геафака чытайце на 4-й стар.*



*ЛЮДЗІ ВЫСОКАГА ГАРТУ*

## ВЁСНЫ ПРЫХОДЗЯЦЬ ЗНОЎ



ЛЁС ГЭТАГА ЧАЛАВЕКА сёлета асэнсоўваецца неяк па-асобаму. Сапраўды, цяпер, калі мы рыхтуемся да 50-годдзя Саюза ССР, прыпамінаецца шмат падзей, прыгадваецца багата розных фактаў, робяцца параўнанні, якія ярка паказваюць вялікі шлях развіцця рэспублікі, вобласці, горада. Калі ж паглядзець яшчэ глыбей, дык бачна, як гісторыя дзяржавы адлюстроўваецца нейкай сваёй гранню ў лёсе ледзь не кожнага з нас.

Ну, узяць хоць бы гэты прыклад: памочнік машыніста паравоза ў мінулым — цяпер прарэктар БДУ імя У. І. Леніна, буйнейшай навучальнай установы Беларусі. Нікому, а тым болей простаму рабочаму Якаву Малышаву, і ў галаву не магла прыйсці такая паралель, асабліва ў адносінах да свайго сына — звычайнага хлапчука з мінскай ускраіны. У Андрэя была свая мара: яму хацелася стаць машыністам паравоза. Хлопца вабілі чыгунка, машыны, над якімі хацелася ўладарыць, асабліва тады, калі ўяўляліся розныя новыя мясціны, куды клікалі шляхі-рэйкі. Сына падахвочваў і бацька, сам чыгуначнік.

Дзіцячая мара паступова ператваралася ва ўсвядомленае жаданне. Пасля Мінскай школы вучнёўства Андрэй Малышаў пайшоў працаваць на чыгунку. Працаваў добра, нездарма ж у хуткім часе меў самы высокі разрад. Аднак... Ці таму, што машына перастала быць сакрэтам, ці таму, што адчуў смак у вучобе, але хлопцам авалодала прага ведаў.

Памочнік машыніста становіцца студэнтам геаграфічнага факультэта Мінскага педінстытута. «Відаць, чыгунка ўсё ж сваю ролю адыграла,—жартуе цяпер Андрэй Якаўлевіч.—Не куды-небудзь пацягнула, а да падарожжаў, да геаграфіі». Падарожжаў, праўда, на першым часе не атрымалася. Былога студэнта адразу назначылі намеснікам дэкана таго самага факультэта, дзе яшчэ нядаўна ён вучыўся. Краіна дапамагла сыну рабочага здзейсніць яго мару, яна вывучыла яго і цяпер прад'яўляла свае строгія патрабаванні.

«Трэба» — значэнне гэтага слова добра ведае Андрэй Якаўлевіч Малышаў. Трэба — і трэцякурснік чытае лекцыі навічкам: ён разумее, што не хапае выкладчыкаў, і неабходна паспяваць і ўмець рабіць усё. Рабіць выдатна. Трэба — і дваццацішасцігадовы дэкан клапоціцца аб раскладзе лекцый і паліве для інтэрната, аб падрыхтоўцы вучоных і новым наборы студэнтаў.

Але вось надарылася магчымасць, нарэшце, ехаць у экспедыцыю. О, блакітная мара — доўгачаканая Сібір! Але ў маі 1941 года з'явілася яшчэ адно трэба — ехаць не ў Сібір, а на Урал. Ну, што ж, на Урал дык на Урал. Але тут прыйшло тое, што перавярнула лёс многім. Вайна. Няўмольнае трэба пасылае Андрэя Якаўлевіча... Не, не на фронт, а шукаць... золата. На ўсе рапарты, патрабаванні, просьбы Малышава тлумачылі, як патрэбна краіне золата. Асабліва цяпер. Трэба — і географ стаў геолагам. Шукаў золата. І знаходзіў.

А пасля... Пасля аж толькі ў канцы саракавых гадоў вярнуўся ён у Мінск. З 1952 года яго лёс звязан з універсітэтам. З 1954 года ён нязменна на пасадзе прарэктара.

Ідуць гады, растуць клопаты. З кожным годам павялічваецца ў БДУ колькасць студэнтаў, павышаюцца патрабаванні да якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. І таму з кожным годам ускладняецца работа ў прарэктара. Але, як заўсёды, камуніст Малышаў выконвае свае справы толькі на выдатна. Нездарма яму першаму ў рэспубліцы прысвоена званне «Выдатнік вышэйшай школы».

Гэта тое, што датычыць службовых абавязкаў прарэктара БДУ. Не менш іх і ў грамадскім жыцці.

Андрэй Якаўлевіч неаднаразовы дэпутат гарадскога і абласнога Саветаў, намеснік старшыні пастаяннай камісіі па народнай асвеце. Шмат часу забіраюць абавязкі члена Камісіі па справах ЮНЕСКО пры ўрадзе рэспублікі. У Беларусі і ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы А. Я. Малышава добра ведаюць як віцэ-старшыню Беларускага таварыства культурных сувязей з ГДР. Урад ГДР узнагародзіў яго залатым, а Саюз нямецкай моладзі — сярэбраным медалем за дзейнасць па ўмацаванню дружбы паміж савецкім і нямецкім народамі. А колькі часу забіраюць у прарэктара абавязкі старшыні савета па прысуджэнню вучоных ступеней у галіне біялагічных і геаграфічных навук!

Шмат клопатаў у гэтага не першай маладосці чалавека. Але, як сцвярджае ён сам, іменна яны трымаюць яго на быстрыні жыцця, не дазваляюць старэць. І да яго зноў і зноў вяртаюцца, прыходзяць вёсны, калі чалавек жыве паўнатою здзейсненых спраў, спадзяваннямі на здзяйсненне новых.

**Т. МУХА.**

## З ГЛЫБОКІМ АНАЛІЗАМ

Цяпер у камсамольскай арганізацыі універсітэта праходзяць справаздачна-выбарныя сходы. Іх асаблівасць у тым, што камсамольцы падводзяць вынік дзейнасці сваёй арганізацыі за ўвесь прайшоўшы год напярэдадні 50-годдзя ўтварэння СССР. Таму мы надаём вялікае значэнне не толькі зменнасці і перавыбарам актыву, але і глыбокаму аналізу работы па ўсіх яе напрамках.

На справаздачна-выбарных сходах у групах, на курсах, патоках і факультэтах неабходна ўсебакова абмеркаваць, як удзельнічаюць студэнты ў жыцці свайго калектыву, наколькі вялікая іх грамадская аддача.

Задача заключаецца ў тым, каб у кожнай пярвічнай камсамольскай арганізацыі справаздачна-выбарны сход прайшоў на высокім ідэйна-палітычным узроўні, арганізавана, па-дзеламому.

Неабходна, каб на сходах атрымалі прынцыповую ацэнку факты, якія не лепшым чынам характарызуюць асобныя факультэцкія арганізацыі: недахопы ў рабоце будаўнічых атрадаў, дэзертырства з сельскагаспадарчых работ, вялікая колькасць «хвасцістаў» і іншыя.

Не трэба баяцца патрабавальнасці. Патрабавальнасць—гэта дзейсны кантроль.

На справаздачна-выбарных сходах асабліва трэба завастрыць увагу на ідэйна - палітычным выхаванні моладзі. Перад вну стаіць задача выхаваць не толькі спецыяліста для народнай гаспадаркі, але і арганізатара-актывіста, праваднікa ў масы ідэй нашай партыі. Неабходна сур'ёзна, па-дзеламому аднесціся да грамадска - палітычнай атэстацыі кожнага студэнта. А гэта найлепшым чынам можна зрабіць на камсамольскім сходзе, у прысутнасці членаў усяго калектыву.

**А. СЛУКА,**
**сакратар камітэта камсамола універсітэта.**

Камсамольскае жыццё

# ІДУЦЬ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫЯ СХОДЫ Ў КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ УНІВЕРСІТЭТА

## СУР'ЁЗНАЯ РАЗМОВА

Пачатак навучальнага года... Як ён складваецца для студэнтаў? Цікава ці зусім наадварот?.. Гэта ў многім залежыць ад таго, хто стане на чале камсамольскай арганізацыі, хто здолее арганізаваць камсамольцаў на цікавыя і карысныя справы. Іменна таму на факультэцкіх справаздачна-выбарных сходах узнімаюцца самыя актуальныя пытанні, вызначаюцца канкрэтныя задачы, адбываецца сур'ёзная, прынцыповая размова аб мэтах і шляхах іх дасягнення.

Давайце паслухаем, што хвалюе камсамольцаў біялагічнага факультэта, аб чым вядуць яны размову на сваім справаздачна-выбарным камсамольскім сходзе.

...Горача і ўсхвалявана гучыць голас сакратара камітэта камсамола Вольгі Нясюк. Дзяўчына прынцыпова дае крытычны аналіз дзейнасці камітэта камсамола факультэта, а таксама бюро курсаў. Асаблівую ўвагу Вольга звяртае на недахопы ў камсамольскай рабоце па павышэнню паспяховасці студэнтаў, а таксама наладжвання дысцыпліны і рэгулярнага наведвання заняткаў. Недастаткова ўвагі было звернута на работу камсамольскіх груп, гаворыць яна. І ці не таму мы яшчэ дзелім групы на актыўныя і пасіўныя, ці не таму ў адной групе камсамольскае жыццё б'е крыніцай, а ў другой — знікае да нуля?!

Разам з тым быў адзначан і станоўчы вопыт камітэта камсамола. На бюро рэгулярна заслухоўвалі адстаючых студэнтаў, аналізавалася становішча паспяховасці, дысцыпліны і наведвання заняткаў студэнтамі, быў наладжан сістэматычны выпуск маланак, дзе асвятляліся гэтыя пытанні.

Усе меры, прынятыя камітэтам камсамола, падпарадкоўваліся адной мэце — павысіць паспяховасць, актыўнасць кожнага.

Крытычна ацаніўшы работу камітэта, камсамольцы адзначылі і поспехі.

— Біяфак заняў першае месца ва універсітэцкім аглядзе студэнцкіх навуковых работ, — гаворыць член СНТ Касцюк.

— Другое месца ў аглядзе мастацкай самадзейнасці універсітэта — гэта вынік вялікай работы камсамольцаў, — адзначае Бондар, адказная за правядзенне культурна-масавай работы.

Нельга не сказаць аб тым, што на біялагічным факультэце добра працуе насценны друк.

Прапанова ацаніць работу камітэта камсамола біяфака станоўча была падтрымана ўсімі камсамольцамі.

Аднак хацелася б адзначыць, што было б пажадана часцей чуць на такіх сходах голас радавога камсамольца, а не толькі членаў камітэта камсамола.

Сход выбраў новы састаў камітэта ў колькасці 15 камсамольцаў, сакратаром аднагалосна зноў была выбрана Вольга Нясюк.

Застаецца толькі пажадаць, каб вынікамі гэтай сур'ёзнай размовы сталі пасапраўднаму дзелавыя рашэнні, карысныя і цікавыя справы камсамольцаў.

**Т. СКІБІЦКАЯ.**
**Прэс-цэнтр камітэта камсамола.**

*Ленінскі залік у студэнтаў IV курса філфака.*





РЫХТУЮЦЦА ДА СПРАВАЗДАЧЫ ФІЛОЛАГІ

## ВУЧЫЦЦА І ВУЧЫЦЬ

**(Са справаздачнага даклада сакратара камітэта камсамола філфака І. РАБЧЫНСКАЙ).**

Адразу ж перад камітэтам камсамола ўзнікла неабходнасць вучыць курсавыя і групавыя бюро камсамольскай рабоце. З гэтай мэтай у лістападзе 1971 г. на факультэце праводзілася вучоба актыву. На працягу двух дзён звыш 170 актывістаў распрацоўвалі асновы камсамольскай работы. На пленарным пасяджэнні, на секцыях выступілі адказныя работнікі ЦК ЛКСМБ, абкома камсамола, камітэта камсамола універсітэта. Загадчык аддзела студэнцкай моладзі В. М. Харавец расказаў аб задачах камсамольскай арганізацыі, што вынікаюць з прамовы Л. І. Брэжнева на Усесаюзным злёце студэнтаў. Падпалкоўнік КДБ В. С. Клягін выступіў з цікавай гутаркай «Ідэалагічныя дыверсіі імперыялізму ў асяроддзі савецкай моладзі».

Камсамольскі актыў працаваў у чатырох секцыях: ідэалагічнай, арганізацыйнай работы, інтэрнацыянальнага выхавання, ваенна-патрыятычнай і спартыўнай работы. Вялікі інтарэс праявілі студэнты да выступленняў намесніка загадчыка студэнцкага аддзела АК ЛКСМБ В. Я. Яськова «Камсамольская група — цэнтр выхаваўчай работы», адказнага сакратара КМА ЦК ЛКСМБ Э. А. Лейкіна «Інтэрнацыянальныя сувязі беларускай моладзі і задачы камітэта камсамола па іх умацаванню і пашырэнню», інструктара аддзела спорту і абаронна-масавай работы ЦК ЛКСМБ А. С. Шурмалёва «Асноўныя напрамкі ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі на сучасным этапе». Такая вучоба дала свае канкрэтныя вынікі. Актыў стаў глыбей разумець свае задачы, ясней бачыць перспектывы камсамольскай работы.

***

Работа камітэта знаходзіцца пад неаслабнай увагай партыйнай арганізацыі факультэта. Перш за ўсё хочацца ўспомніць аб той добрай традыцыі, якая існуе на факультэце. Штогод на адкрытым партыйным сходзе пры ўдзеле ўсяго студэнцкага актыву камуністы філфака вядуць вялікую і сур'ёзную размову аб рабоце нашай камсамольскай арганізацыі. Не быў выключэннем і гэты год. Прынцыповае абмеркаванне камуністамі пытання «Аб стане работы камсамольскай арганізацыі» ў значнай ступені актывізавала нашу работу і дапамагло выправіць цэлы рад памылак.

Па рашэнню партыйнага бюро ва ўсіх курсавых арганізацыях прайшлі камсамольскія сходы: «Роля камсамола ў падрыхтоўцы спецыяліста-філолага». Яны былі старанна падрыхтаваны, праходзілі з удзелам прадстаўнікоў партыйнага бюро, дэканата, кураратараў. Разам з абмеркаваннем агульных праблем падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў яны выліліся ў канкрэтнае абмеркаванне спраў на курсах і сталі ў нейкай ступені паваротнымі ў рабоце камсамольскай арганізацыі факультэта.

***

Палітыка - выхаваўчая работа была сканцэнтравана на падрыхтоўцы і правядзенні Усесаюзнага Ленінскага заліку «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё». Галоўны сэнс Ленінскага заліку камітэт камсамола бачыць у павышэнні актыўнасці кожнага камсамольца. Мінулагодні вопыт здачы Ленінскага заліку дапамог выпрацоўцы новых форм яго правядзення. Ад курсавых заданняў мы перайшлі да групавых. Асноўны іх напрамак — шэфская работа. І гэта правільна, таму што факультэт рыхтуе выкладчыкаў школ, а пазавучэбная практыка студэнтаў І—ІІ курсаў у школах дапамагае набываць навыкі, якія спатрэбяцца ў будучай рабоце. Так, ІІ курс аддзялення беларускай мовы і літаратуры шэфствуе над Краснінскай СШ Маладзечанскага раёна, на ІІІ курсе рускага аддзялення ў кожнай групы ёсць свая школа, І і ІІ групы чацвёртага беларускага пачынаюць работу ў 81-й школе г. Мінска. Усе групы перадалі сваім школам добрыя бібліятэчкі, падрыхтавалі і правялі тэматычныя вечары, дапамагаюць у афармленні кабінетаў, праводзяць гутаркі аб прафесійнай арыентацыі вучняў, чытаюць лекцыі аб універсітэце.

Акрамя таго, пры кінатэатры «Піянер» для старшакласнікаў мінскіх школ праводзяцца тэматычныя кіналекторыі па курсу рускай савецкай літаратуры. Нашы камсамольцы — студэнты чацвёртай групы V рускага — перад кожным фільмам выступаюць з лекцыямі аб творчасці пісьменнікаў і аб экранізацыі іх твораў.

## ДУМАЦЬ АБ БУДУЧЫМ

Пры падвядзенні вынікаў летняй сесіі 1971-72 г. аказалася, што сярэдні бал у вучобе студэнтаў філалагічнага факультэта складае 4,04. На першы погляд здаецца, што вучоба ідзе нядрэнна. Тым не менш ёсць студэнты, якія ў кожнай сесіі маюць запазычанасць. Гэта такія, як Гуліна, Зезятко (ІІ рускі), Грукала, Старавойтава, Старасвецкая, Парфінава (ІІІ рускі), Гарбузава (IV рускі), Пашкевіч (ІІ беларускі), Каралько (IV беларускі). Якія меры былі прыняты да гэтых студэнтаў? Іх неаднаразова выклікалі на пасяджэнні акадэмсавета, разбіралі асабістыя справы на пасяджэннях метадычных камісій. Мне здаецца, што пара ім або сур'ёзна ўзяцца за вучобу, або вызваліць месца для людзей, якія сапраўды хочуць вучыцца.

Кожны будучы настаўнік павінен думаць аб сваіх вучнях. Бо яму аддадуць у рукі сорак чалавек, якіх ён абавязан навучыць усяму, чым валодае сам. А што зможа даць свайму вучню настаўнік, які (не стану гаварыць аб самастойнай рабоце) не хоча узяць нават тое, што яму даюць.

Праўда, вельмі многія ў нас вучацца толькі на выдатна і актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці. Такія, як Ільюшына, Палазкова (ІІІ рускі), Ракавецкая, Кулак (V рускі), Прыгодзіч, Моніч, Лойка (ІІІ беларускі), Кісялёў (IV беларускі), Адамушка, Жук, Цудня (V беларускі), выдатна спраўляюцца са сваімі студэнцкімі абавязкамі, і можна з упэўненасцю сказаць, што яны стануць сапраўднымі настаўнікамі і змогуць даць сваім вучням неабходныя веды.

Нашы студэнты-выдатнікі і студэнты, якія вучацца на добра і выдатна, вельмі актыўна ўдзельнічаюць у справах факультэта і універсітэта.

Хочацца сказаць некалькі слоў аб грамадскіх падрыхтоўчых курсах пры універсітэце. У мінулым годзе падрыхтоўчым аддзяленнем займаўся ІІІ (цяпер IV) рускі. Увесь год чыталі лекцыі Е. Каганава, Р. Асташова, Н. Хурс. Гэтыя курсы даюць вельмі многа і студэнтам, якія вядуць заняткі, і вучням.

**В. КАРНЕВІЧ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола па вучэбнай рабоце.**

## ДА СУСТРЭЧЫ, ТРЭЦІ СЕМЕСТР!

Трэці семестр! Як многа прыемных і радасных успамінаў выклікаюць гэтыя словы. Адразу прыгадваеш свой атрад, іменна свой, таму што нішто так хутка і моцна не згуртоўвае калектыў, як добрая дружба, адзіныя мэты і задачы, камуна.

Прайшло ўжо паўтара месяца, як закончыўся працоўны семестр. Ён меў асаблівае значэнне: быў ударным у гонар 50-годдзя утварэння СССР. Гэта абавязвала да многага. А цяпер, здавалася б, пара завяршыць работу, пайсці ў запас і чакаць новага працоўнага. Але для чаго тады ствараліся агітбрыгады, умацоўваліся добрыя традыцыі? І вось байцы гарадскога атрада «Верасок» вырашылі прадоўжыць дзейнасць атрада да наступнага працоўнага семестра, захаваўшы ўсе добрыя пачынанні. «Верасок» жыве, жыве тым жа паўнакроўным жыццём. Амаль кожны дзень мы збіраемся разам, цікавімся справамі сяброў, бядзём падрыхтоўку да злёту, вечара, афармляем стэнд, альбом. Па-ранейшаму пры сустрэчах гучаць любімыя песні. Наперадзе многа цікавых спраў: сумесная паездка ў Ленінград, выезды агітбрыгады, шэфства над домакіраўніцтвам і многае іншае.

Зладжаны рытм работы, дакладна прадуманы кожны дзень, строгае выкананне распарадку і працоўнай дысцыпліны, павага адзін да аднаго, падпарадкаванне думцы калектыву — усё гэта дапамагло зацвердзіць сваю камуну.

Адзярноўка адкосаў Ракаўскай шашы. Так вызначаў нашу працу дагавор. Уяўляліся доўгія адкосы уздоўж шашы, а на самай справе аказалася не шаша, на якой мы бачылі сябе амаль у ролі выязнога атрада, а жылы раён з толькі што пабудаванымі дамамі. Добраўпарадкаваць тэрыторыю навокал і было нашай задачай. Сюды ўваходзіла ўзвядзенне дзіцячых і спартыўных пляцовак, добраўпарадкаванне тэрыторыі школы і дзіцячага сада. Работа аказалася вельмі цікавай. А штодзённае падвядзенне вынікаў садзейнічала падтрыманню раўнамернага рытму работы. Таму замест 10 тысяч рублёў па плану асвоена 30 тысяч, здадзены ў эксплуатацыю аб'екты 13 жылых дамоў, дзіцячага сада і школы, адзярнована 7080 кв. м адкосаў, добраўпарадкавана 7800 кв. м газонаў і многае іншае.

У вольны час байцы чыталі лекцыі, працаваў кансультацыйны пункт пры домакіраўніцтве, ішлі рэпетыцыі агітбрыгады і выступленні з канцэртамі, арганізоўваліся сустрэчы і экскурсіі.

Атрад заняў першае месца сярод 56 гарадскіх студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Яму прадастаўлена права выезду на будоўлі краіны. Гарадскі штаб прадставіў наш калектыў да ўзнагароды Граматай ЦК ВЛКСМ, многія байцы ўзнагароджваюцца граматамі АК, РК і ГК ЛКСМБ, каштоўнымі падарункамі. Трэст № 4 заахвочвае працу атрада паездкай у Ленінград.

Пастараемся і ў далейшым з гонарам апраўдваць давер'е.

**А. НАДОЛЬСКАЯ,**
**камандзір СБА «Верасок» філфака.**

# СЁННЯ Ў НАС У ГАСЦЯХ ГАЗЕТА КАЗАНСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. УЛЬЯНАВА-ЛЕНІНА






**Казанскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Ульянава-Леніна — адна з буйнейшых навучальных устаноў краіны. У ім 8 факультэтаў, 65 кафедр, на якіх рыхтуюць спецыялістаў больш чым па 20 спецыяльнасцях і 60 спецыялізацыях.**

**Што стварае славу вну! Яго навуковыя школы і выпускнікі. У КДУ багатая гісторыя: школы матэматыкаў, хімікаў, лінгвістаў і многія іншыя вядомы ва ўсім свеце. І цяпер ва універсітэце моцныя педагагічныя кадры — 80 дактароў і 420 кандыдатаў навук. Сярод іх 140 вучоных - татар. Многія савецкія вучоныя за работы, выкананыя ў КДУ, атрымалі Ленінскія і Дзяржаўныя прэміі. Гэта акадэмікі Е. К. Завойскі, А. Е. і Б. А. Арбузавы, прафесары А. Ф. Самойлаў, Н. Г. Чатаеў, А. З. Пятроў і іншыя.**

**З кожным годам расце і ўмацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта. У першай палове 1973 года будзе здадзен у эксплуатацыю 16-павярховы корпус фізічнага факультэта. А ў 1974 годзе на новае месца жыхарства ў 20-павярховы корпус пераедуць гісторыка-філалагічны, механіка-матэматычны, геаграфічны факультэты, а таксама кафедры грамадскіх навук і замежных моў. Там жа размесціцца і навуковая бібліятэка імя М. І. Лабачэўскага. Падземнае кнігасховішча прыме 4,5 млн. тамоў кніг. Хутка пачнецца будаўніцтва трэцяга корпуса, у якім размесяцца дзве кінафікаваныя залы на 1.300 і 500 месц, спартыўны комплекс з шасці спартыўных залаў. У 1973 годзе будзе пабудаван студэнцкі інтэрнат на 632 чалавекі.**

**Новыя карпусы — гэта і новае абсталяванне. Цяпер для студэнтаў і аспірантаў адкрыта вылічальная зала, дзе размешчаны дзве электронна - вылічальныя машыны «НАИРИ» і каля трыццаці малых машын.**

## НА ПАКЛОН ДА ІЛЬЧА...

Бясконцым патокам паступаюць заяўкі ва універсітэцкі музей У. І. Ульянава-Леніна. Усе, хто хоць на некалькі дзён прыязджае ў Казань, абавязкова стараюцца пабываць там, дзе некалі вучыўся Уладзімір Ульянаў. Экскурсіі вядуцца ў асноўным па трох тэмах: «Ленін — правадыр Кастрычніка», «Ленін у сібірскай ссылцы», «Казанскі перыяд жыцця У. І. Леніна».

Заяўкі паступаюць не толькі ад іншагародніх і замежных гасцей, але і ад нашых, казанцаў.

У ленінскія дні ў музеі праводзіцца ўрачысты прыём акцябрат у піянеры.

У кнізе водгукаў—падзякі работнікам музея, падпісаныя настаўнікамі Украіны, рабочымі Данбаса, ташкентцамі, мінчанамі, в'етнамскімі студэнтамі, румынскім прафесарам...

## ШЛЯХІ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**«Вучоны савет інстытута філасофіі Балгарскай акадэміі навук, кіруемай дырэктарам інстытута філасофіі БАН, членам палітбюро ЦК БКП акадэмікам Тодарам Паўлавым, прысудзіў савецкаму вучонаму Анатолю Косараву вучоную ступень кандыдата філасофскіх навук. А. Косараў з'яўляецца першым савецкім філосафам, атрымаўшым вучоную ступень у Балгарыі».**

Аб гэтым паведамляла Балгарскае тэлеграфнае агенцтва.

...Усяго сем год аддзяляе выпускніка гісторыка-філалагічнага факультэта Анатоля Косарава ад абароны ім кандыдацкай дысертацыі.

Адразу ж пасля заканчэння універсітэта яго пакідаюць асістэнтам на кафедры філасофіі і навуковага камунізму. У 1969 годзе Анатоль Косараў становіцца аспірантам, працуе над тэмай «Камуністычная партыя і іншыя дэмакратычныя партыі ў сацыялістычным грамадстве» (на вопыце НРБ), а ў канцы 1970 года выязджае на стажыроўку ў інстытут філасофіі Балгарскай акадэміі навук.

Там ён завяршыў работу над кандыдацкай дысертацыяй і атрымаў рэкамендацыі да абароны. Тады ж яму было прапанавана абараняць дысертацыю ў Сафіі. Інстытут АН СССР даў на гэта свой дазвол.

Малады вучоны паставіў задачу — даследаваць працэс развіцця ўзаемаадносін марксісцка - ленінскай партыі з іншымі дэмакратычнымі партыямі ў ходзе барацьбы за дэмакратыю і сацыялізм, высветліць, як канкрэтна - гістарычныя ўмовы ўплываюць на формы і метады ўзаемаадносін камуністычных і іншых дэмакратычных партый па ўмацаванню адзінства і супрацоўніцтва ў барацьбе за сацыялізм. Асаблівая ўвага звяртаецца на вывучэнне вядучай ролі Камуністычнай партыі, яе дапамогі іншым дэмакратычным партыям у іх арганізацыйным і палітычным умацаванні.

Дысертацыя напісана на вопыце Народнай Рэспублікі Балгарыі, дзе паспяхова здзяйсняецца супрацоўніцтва дзвюх партый—Балгарскай камуністычнай партыі (БКП) і Балгарскага земляробчага народнага саюза (БЗНС).

Вучоны савет інстытута філасофіі Балгарскай АН аднадушна прысудзіў Анатолю Пятровічу Косараву ступень кандыдата філасофскіх навук.





● Будынак вылічальнага цэнтра.

● У машыннай зале ВЦ.

Фота В. Стрыхара.

## Дыпломнікі—КамАЗу

Будаўніцтва аўтагіганта на Каме стала агульнанароднай справай. Задаюць пытанне: які ўклад можа ўнесці універсітэт у гэтую справу? Дыпломнікі мехмата далі на яго канкрэтны адказ.

На абароне дыпломных работ часта ўпамінаецца слова «КамАЗ». Вялікая група студэнтаў мехмата прыняла ўдзел у распрацоўцы аўтаматызаванай сістэмы кіравання для Камскага аўтазавода. Кіраўніцтва комплексам гіганцкіх заводаў немагчыма без прымянення вылічальнай тэхнікі. А каб прывесці гэтую тэхніку ў дзеянне, патрэбен вялізны комплекс праграм. Каму, як не матэматыкам-прыкладнікам, брацца за гэтую справу!

Абсталяванне, станкі, матэрыялы прыбываюць у Набярэжныя Чаўны з усіх канцоў краіны і з-за рубяжа. Толькі для таго, каб сачыць за іх паступленнем і ўстаноўкай, патрэбны сотні вачэй і рук. З гэтай пары такую работу будуць выконваць машыны па праграмах, складзеных дыпломніцамі Н. Сцяпанавай і Л. Ярафеевай. Іх праграмы адладжаны і ўжо восенню гэтага года пайшлі ў дзеянне. Работы абедзвюх дыпломніц заслужылі адзнаку «выдатна».

Цэлая група дыпломнікаў склала праграмы, якія заменяць вялікі штат бухгалтэрыі на КамАЗе. Прафесія бухгалтара стане там вялікай рэдкасцю. Уручную будуць заносіцца ў машыну толькі звесткі аб выпрацоўцы. Астатнюю бухгалтарскую работу будуць выконваць машыны.

Дзяржаўная камісія асабліва адзначыла работы дыпломнікаў В. Грыгор'ева і Н. Пракудзіна. Іх працы вызначаюцца глыбокім матэматычным падыходам да пастаўленых задач і вялікай практычнай карысцю, якую яны прынясуць КамАЗу.

**Р. НІГМАТУЛІН,**
**дацэнт.**



*Сотні кіламетраў зрабіў «Снежны дэсант» Казанскага універсітэта па дарогах баявой славы савецкага народа. Яго шлях пралёг і па гераічнай беларускай зямлі. Студэнты пабывалі ў Віцебску, Мінску, Брэсце і іншых гарадах і вёсках, якія захавалі памяць аб мінулых бітвах з ворагам, усклалі вянкі да абеліскаў і помнікаў загінуўшым.*

*НА ЗДЫМКУ: «Снежны дэсант» гісторыка-філалагічнага факультэта ў Беларусі.*

Фота І. ХІСАМІЕВА.

## КАЛІ СПАСЦІГЛА НЯЎДАЧА...

Што ж рабіць, калі ваш штурм навукі закончыўся няўдачай? Не адчайвайцеся, калі ласка, зайдзіце ў камітэт камсамола КДУ. Сёлета тут створан штаб па ўладкаванню на працу абітурыентаў, якія не паступілі ва універсітэт.

Штаб устанавіў сувязі з многімі прадпрыемствамі Казані: заводам арганічнага сінтэзу, трэстамі, хімзаводам і іншымі.

Пры ўладкаванні на працу ўлічваюцца здольнасці абітурыентаў, іх жаданне працаваць па спецыяльнасці. Так, некалькі чалавек, паступаўшых на біяфак, геафак, былі прыняты лабарантамі на кафедры універсітэта, у біялагічны інстытут АН СССР, Казанскі заабатанічны сад. У аддзел аховы Савецкага аддзялення міліцыі былі ўладкаваны абітурыенты, паступаўшыя на юрфак.

Некаторыя прадпрыемствы самі ўстанавілі кантакты з універсітэтам.

Нямала юнакоў і дзяўчат накіравана па камсамольскіх пуцёўках у Ніжнекамск і Набярэжныя Чаўны.

**В. СЦЯПАНАЎ.**

## НАС ЗАВУЦЬ «АЛЁНКА»

Давайце знаёміцца: ансамбль «Алёнка». Але адна назва мала аб чым гаворыць. Наш ансамбль — гэта 20 дзяўчат з біяфака, задорных, вясёлых, не падобных адна на другую ні па характару, ні па знешняму выгляду. Але нас аб'ядноўвае адно — любоў да танца. Танец — гэта наша другое жыццё.

Як жа мы пачыналі? Не было касцюмаў—шылі самі. Не было кіраўніка — кіравалі самі. Але гэты час станаўлення ўжо ззаду. На справаздачным канцэрце, прысвечаным трохгадовай рабоце ансамбля, было зразумела, што мы не стаім на месцы, не дарэмна махаем рукамі. За гэты час было столькі танцаў, што ўсе яны не змаглі ўвайсці ў праграму. Некаторыя нашы танцы гледачы бачылі не адзін раз. Хіба можна без усмешкі глядзець вясёлы «Чарльстон» у выкананні Тані Смірновай і Альфрэда Мустафіна (нашага кіраўніка)! Хіба можна застацца раўнадушным да «Татарскага сувеніра», «Шэйка», «Рускай кадрылі»! А танец «Імправізацыя», упершыню паказаны на гэтым справаздачным канцэрце, быў незвычайны і новы па самой сваёй структуры. Лепшай узнагародай нам былі доўгія, шчодрыя апладысменты гледачоў.

Але вось вечар прайшоў, канцэрт закончыўся. А на наступны дзень мы праводзілі ў Алма-Ату нашага кіраўніка. Ён закончыў аспірантуру і цяпер выязджаў па размеркаванню. Было сумна. Але ж мы, дзяўчаты, застаёмся разам!

І нашы рэпетыцыі працягваліся. Цяпер іх вёў Жэня Брэйдбург. Першы вынік нашай сумеснай работы — жартоўны танец «Тустэп». Гледачы прынялі яго на «біс», аб ім многа гаварылі. У нашым рэпертуары з'явілася яшчэ некалькі новых танцаў.

Так мы выраслі. Нам ужо 4 гады. Сёлета на фестывалі мастацкай самадзейнасці наш факультэт падзяліў першае месца з фізфакам і быў узнагароджан прызам журы за лепшую арганізацыю канцэрта. У гэтым ёсць і наша праца.

**Е. ТАБАКІНА.**



**На здымку:** ансамбль «Алёнка» выконвае «Рускі карагод».

# ІХ ПРЫНЯЛА ГЕАФАКІЯ



Маляўніча ўпрыгожаны вестыбюль і аўдыторыі геаграфічнага корпуса. На сценах—жартоўныя мініяцюры, вясёлыя апавяданні са студэнцкага жыцця. Прыбраныя, збіраюцца ў 58-ю аўдыторыю запрошаныя на вечар. Хвалююцца старшакурснікі, апошнія рэпетыцыі ва ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, усё яшчэ адпрацоўвае свой выхад каралева «Заліковая кніжка». Моцна стукаюць сэрцы першакурснікаў. Гэта ж іх першы вечар у вну, самы ўрачысты, самы цудоўны. Яшчэ зусім нядаўна яны вельмі хваляваліся, пераступаючы парог вузаўскай аўдыторыі, а цяпер — паўнапраўныя студэнты. Сёння старшакурснікі прымаюць іх у сваю чароўную краіну — Геафакію.






Гучыць музыка. У аўдыторыю ўваходзяць першакурснікі. Сакратар камітэта камсамола В. Раманаў дакладвае аб прыбыцці першакурснікаў для ўрачыстай цырыМоніі пасвячэння ў студэнты. Ад імя выкладчыкаў імяніннікаў вітаюць намеснік дэкана Р. А. Жмойдзяк, доктар геаграфічных навук А. Я. Шкляр, дацэнт Ф. С. Фешчанка; выступае студэнтка V курса Зіна Шаблінская. Многа цёплых і сардэчных слоў было сказана ў той вечар першакурснікам.

І вось наступае самы ўрачысты момант. На сцэну падымаецца каралева «Заліковая кніжка» і Вярхоўны жрэц краіны Геафакіі. Цішыня ў аўдыторыі. Цяпер першакурснікі даюць клятву на вернасць студэнцкаму жыццю. «Клянёмся! Клянёмся! Клянёмся!» — разносіцца па факультэту. Вярхоўны жрэц краіны Геафакіі ўручае першакурснікам сімвалічны студэнцкі білет. І заканчваецца цырымонія пасвячэння гімнам геафака.

А пасля —слова малодшым. Яны горача дзякуюць усім, хто паклаў многа працы і намаганняў, каб вечар атрымаўся вясёлым і цікавым, дзякуюць выкладчыкам і дораць усім, хто знаходзіцца ў аўдыторыі, сваю песню. Добра спяваюць і чытаюць, і верыцца, што ў нашых пяцікурснікаў дастойная змена.

Доўга яшчэ чулася музыка ў корпусе геафака. Добра падрыхтаваўся да вечара вакальна - інструментальны ансамбль «Пілігрымы» і прынёс усім вялікае задавальненне. З усёй адказнасцю аднёсся да даручанай справы III курс (сакратар курсавога бюро М. Шаблакоў). За добрую арганізацыю вечара студэнтам III курса аб'яўлена падзяка.

**В. АНТАНОВІЧ,**
**адказная за культмасавы сектар камітэта камсамола геафака.**





## ДА ЮБІЛЕЮ ПАЭТА

*Кастрычніцкім вечарам у адной з чытальных залаў галоўнага корпуса сабраліся аматары беларускай паэзіі на літаратурны вечар, прысвечаны 60-годдзю з дня нараджэння народнага паэта М. Танка.*

*Аб жыцці і творчасці паэта расказаў дацэнт кафедры беларускай літаратуры В. П. Рагойша. Затым слова бяруць члены універсітэцкага літаб'яднання «Узлёт». Люба Тарасюк і Анатоль Шушко прачыталі вершы М. Танка. Са сваімі новымі вершамі, прысвечанымі народнаму паэту Беларусі, пазнаёміў прысутных выкладчык беларускай літаратуры Р. М. Семашкевіч.*

*У заключэнне выступіў дацэнт кафедры беларускай літаратуры паэт Ніл Гілевіч. Ён прачытаў некалькі ўрыўкаў з вянка санетаў «Нарач», прысвечаных М. Танку.*

*В. ЛІДЗІНА.*

## ВОЧЫ ВОСЕНІ

...Яна дагарала апошнімі астрамі, сыпала з дрэў частым дажджом залатых лістоў, укрывала вуліцы і праспекты стракатым дзівосным дываном... і пазірала на горад пажаўцелымі вачамі-лістамі, задумлівымі і трохі сумнымі...

Менавіта такая карціна паўстала перада мной, калі я перагортвала старонкі зборніка вершаў, дзе змешчаны лірычныя восеньскія пейзажы.

Вершы, вершы... Шчырыя, душэўныя, а таму—вельмі хвалюючыя і блізкія. Яны жывуць з намі не як нешта асобнае. аддзеленае ад нашага светаўспрымання. Зусім наадварот. Паэзія крочыць з намі побач, дапамагаючы глядзець на свет больш шырока, бачыць у звычайных з'явах нешта цікавае, прыгожае.

Глядзіце-глядзіце! Вунь павольна апускаецца на маўклівую зямлю залаты матыль, вось-вось дакранецца ён да мокрага асфальту, але, раптоўна падхоплены парывам жвавага ветру, нясецца далей, спяшаецца: «Хутчэй, хутчэй!.. »

Чаму я гавару менавіта аб восеньскай лірыцы? Цяжка сказаць. Можа таму, што нельга глядзець з халоднай абыякавасцю на прыгажуню-Восень, а можа таму, што яшчэ ў дзяцінстве, узбіраючыся на калені маці, ласкава прасіла: «Мамачка, прачытай пра восень» і уважліва-уважліва слухала:

Кроет уж лист золотой
Влажную землю в лесу...

І здавалася, я іду паміж маіх лясных сяброў, ціха вітаюся з імі, чую іх пявучы перазвон, асцярожна ступаю на дыван, затканы золатам і пурпурам.

Я моўчкі перагортваю восеньскую лірыку і... бачу вочы восені, задумлівыя і трохі сумныя...

Т. СКІБІЦКАЯ.

● *ШТО ДЛЯ МЯНЕ ПАЭЗІЯ*

## ВЕРНАЯ СЯБРОЎКА

Вершы, як і музыку, не слухаць трэба, а чуць, успрымаць душою, сэрцам. Прыслухайцеся да гучання кожнага радка, кожнага слова — і не можа таго быць, каб яны не кранулі адпаведнай струны вашай душы. Прыслухайцеся...

У маё жыццё паэзія ўвайшла, калі я была яшчэ дзіцём і мама вечарамі чытала вершы Я. Купалы пра хлопчыка і лётчыка, пра Янку, пра Алесю, што «пералётнай птушкай» паляцела да сонца. З часам прыйшло глыбокае захапленне паэзіяй. Што (а, мабыць, правільней—хто) для мяне паэзія цяпер? Найлепшая, самая верная сяброўка. З ёю і ў цяжкія хвіліны—лягчэй, і ў радасці—яшчэ радасней.

Я многа вершаў ведаю напамяць. Люблю нашых беларускіх вядомых і пачынаючых паэтаў: П. Броўку, М. Танка, Э. Агняцвет, С. Гаўрусёва, М. Лужаніна, С. Грахоўскага, Я. Янішчыц, Ю. Фатнева, Н. Тулупаву. Апошняе захапленне—Нэля Тулупава. У мінулым годзе выйшла яе першая кніжка вершаў «Станцыя надзей».

Вечныя і злабадзённыя, грамадскія і асабістыя праблемы знаходзяць сваё адлюстраванне ў творах лепшых нашых паэтаў. І я ўпэўнена, што і праз тысячу год нашчадкі знойдуць у нашай паэзіі тое неўміручае, вечнае, што адпавядае адначасова эстэтычным патрабаванням розных пакаленняў.

**М. ШЫМКО,**
**студэнтка І курса журфака.**

● *РАЗМОВУ ПРАЦЯГВАЮЦЬ ЖУРНАЛІСТЫ*

## ПАЭТАМ МОЖАШ ТЫ НЕ БЫЦЬ...

Я з цікавасцю пазнаёміўся з разважаннямі філолагаў С. Палітыкі і Л. Аўгусціновіч аб ролі паэтычнага слова ў іх жыцці.

Пытанне: што для мяне паэзія? — на маю думку, не такое ўжо і лёгкае, як здаецца на першы погляд. Я згодзен з меркаваннем С. Палітыкі і Л. Аўгусціновіч, што паэзія фарміруе ў чалавеку пачуццё прыгожага, прывівае любоў і адданасць да сваёй Радзімы.

Аднак мне незразумела, чаму, магчыма, праз тысячу год, як піша С. Палітыка, тагачасныя людзі з усмешкай будуць глядзець на нашу сённяшнюю літаратуру і на паэзію ў тым ліку. Па-мойму, такая думка не мае падставы. Возьмем хоць бы такі прыклад: многія вякі аддзяляюць нас ад перыяду росквіту антычнай літаратуры. І тым не менш мы з асалодай чытаем бяссмяротныя «Іліяду» і «Адысею» Гамера, «Працы і дні» Гесіода, трагедыі Эсхіла, а таксама іншых родапачальнікаў сусветнай літаратуры. Я не бачу нічога ў гэтых творах, што магло б выклікаць усмешку. Наадварот, вялікія майстры літаратурнага слова адышоўшых у нябыт дзён нібы запрашаюць нас зрабіць падарожжа ў гісторыю, паглядзець, адчуць, чым дыхаў чалавек у тую эпоху, якія думкі хвалявалі яго, стаць нябачным удзельнікам жорсткай барацьбы супраць захопнікаў. Чалавецтва будзе вечна ўдзячна антычным пісьменнікам, якія праз тысячагоддзі даюць нам магчымасць, чытаючы іх цудоўныя творы, адчуваць біццё пульса жыцця тых далёкіх часін.

Я дазваляю сабе зрабіць такое параўнанне: сусветная літаратура падобна на шматпавярховы дом. Карпатліва кладзецца цагліна да цагліны — і неўзабаве мы бачым прыгожы сучасны будынак. Але паспрабуйце, скажам, выкінуць колькі там цаглін з таго дома, і ён адразу згубіць сваю прывабнасць, сваю першапачатковую прыгажосць. Так і з сусветнай літаратурай, якая развівалася на працягу ўсяго існавання чалавецтва. Нельга выкінуць, як тыя цагліны, асобныя творы, бо яны напісаны, вобразна кажучы, самой гісторыяй.

Але пара вярнуцца ў наша сёння. Кожны год у нашай краіне выдзецца шмат кніг паэзіі. Іх аўтары — людзі, якія зусім не падобны адзін да другога. Ёсць літаратары, як адзначыў на V з'ездзе пісьменнікаў М. Шолахаў, сапраўдныя варашылаўскія стралкі. Творы, напісаныя імі, нясуць чытачу найвялікшую асалоду, вылучаюцца з мора іншых паэтычных зборнікаў нечакана новымі вобразамі, закончанасцю думкі, умела знойдзенымі параўнаннямі. Такія творы сапраўды могуць даць многае.

Але, на жаль, — і я не адкрываю Амерыкі — яшчэ з'яўляюцца ў друку вершы, аўтары якіх далёка не варашылаўскія стралкі. Гэта аб іх гаворыць Яўгеній Еўтушэнка: «Колокольчиков много, а набата нет».

Усім сказаным я меў намер падкрэсліць неабходнасць навучання адрозніваць вершы-званочкі, якія нічога не даюць, акрамя дарэмна страчанага часу (а яго не так ужо і многа ў студэнтаў) ад вершаў-набатаў. Апошнія сціпла і цярпліва чакаюць свайго часу на паліцах бібліятэк, чакаюць, каб увайсці ў чый-небудзь пакой добрым дэрадчыкам, настаўнікам. А такіх кніг у нас большасць.

Калі гаварыць пра сябе, я з вялікай павагай адношуся да паэзіі. Прыемна сустракаць кожны новы зборнік таго ці іншага беларускага майстра вершаванага радка. Асабліва цікаўлюся творчасцю маладых паэтаў: Яўгеніі Янішчыц, Міколы Мінчанкі, Віктара Ракава, Леаніда Дайнекі, Нэлі Тулупавай і іншых.

Вядома, нехта ў маіх нататках знойдзе спрэчныя пытанні, у некага гэтыя радкі выклічуць патрэбу выступіць на старонках нашай газеты. Асабліва хацелася б, каб наконт паэзіі сказалі некалькі слоў фізікі. Бо кажуць, што паміж імі і намі, лірыкамі, існуе спрадвечная спрэчка. Цікава, якой думкі аб паэзіі прытрымліваюцца яны?

І яшчэ. Вельмі было б пажадана, каб сваімі думкамі падзяліліся вядомыя паэты, якія выкладаюць ва універсітэце. Думка прафесійных літаратараў аб паэзіі зацікавіць шырокае кола студэнтаў.

**Б. ЗАДАЛЯ,**
**студэнт І курса факультэта журналістыкі.**

Дэканат, партбюро, прафбюро, увесь калектыў гістарычнага факультэта з глыбокім жалем паведамляюць аб заўчаснай смерці выкладчыка кафедры новай і навейшай гісторыі МАЦВІЕНКІ Браніславы Сцяпанаўны і выказваюць глыбокае спачуванне родным і блізкім нябожчыцы.

Калектыў юрыдычнага факультэта выказвае глыбокае спачуванне дацэнту кафедры крымінальнага працэсу Я. А. Мацвіенку з прычыны напаткаўшага яго вялікага гора—заўчаснай смерці жонкі Браніславы Сцяпанаўны.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Заказ 1209.
АТ 01470